Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА “Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
___________________ Ю.П.Бондар
“____” _________________ 2011 г.
Рэгістрацыйны № ВД- _____ / вуч.

# СУСВЕТНАЯ І БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ЮНАЦТВА

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11- 01 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (менеджмент)*
*спецыялізацыі 1-23 01 11- 01 04 Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2011

**Складальнікі:**

*В.С.Варапаева*, прафесар кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*Г.М.Друк*, дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*А.С.Шылава*, загадчык кафедры прыватных методык факультэта павышэння кваліфікацыі спецыялістаў адукацыі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*Н.А.Ляйко*, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 9 ад 14.05.2010 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 1 ад 05.10.2010 г.)

Адказны за рэдакцыю *В.Б.Кудласевіч*
Адказны за выпуск *В.С.Варапаева*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Сусветная і беларуская літаратура для дзяцей і юнацтва” мае прынцыпова важнае значэнне для ўніверсальнай падрыхтоўкі спецыялістаў дзіцячых, юнацкіх, школьных, а таксама публічных бібліятэк, якія абслугоўваюць дзяцей.

У курсе разглядаюцца творы сусветнай і беларускай дзіцячай літаратуры, якія ўвайшлі ў кола чытання дзяцей і сталі важным сродкам у сістэме выхавання гарманічна развітой асобы.

Дысцыпліна “Сусветная і беларуская літаратура для дзяцей і юнацтва” цесна звязана з гуманітарнымі прадметамі: “Беларуская і сусветная літаратура”, “Педагогіка і псіхалогія”, “Эстэтыка і гісторыя мастацтваў”, а таксама “Дзіцячае чытачазнаўства і бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей, падлеткаў, юнацтва”.

Праграма складаецца з чатырох раздзелаў:

1) гісторыя дзіцячай літаратуры;
2) руская дзіцячая літаратура XX – пачатку XXI ст.;
3) дзіцячая літаратура далёкага замежжа;
4) беларуская дзіцячая літаратура.

***Мэта*** курса: даць сістэмнае ўяўленне аб дзіцячай літаратуры як відзе мастацтва, як сродку пазнання чалавека і яго жыцця, абапіраючыся на веды студэнтаў па псіхалогіі, педагогіцы, літаратуразнаўстве, “дарослай” літаратуры, эстэтыцы.

***Задачы*** вывучэння прадмета:

– раскрыць спецыфіку і асноўныя заканамернасці развіцця літаратуры для дзяцей і юнацтва як арганічнай і своеасаблівай часткі агульнай мастацкай культуры народаў;

– пазнаёміць студэнтаў з лепшымі творамі сусветнай і беларускай літаратуры для дзяцей і юнацтва, з індывідуальнымі асаблівасцямі творчай манеры пісьменнікаў;

– дапамагчы будучым кіраўнікам дзіцячага чытання засвоіць прынцыпы адбору літаратуры для дзяцей і юнацтва;

– даць уяўленне пра методыку літаратурна-педагагічнага і эстэтычна-функцыянальнага аналізу твораў разнастайных відаў і жанраў.

У выніку вывучэння курса студэнт павінен ***ведаць:***

– спецыфіку дзіцячай літаратуры як віду мастацтва;
– лепшыя творы сусветнай літаратуры і іх аўтараў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– месца і ролю літаратуры для дзяцей і юнацтва ў сістэме выхавання гарманічнай асобы;

***умець:***

– аналізаваць творы мастацкай літаратуры для дзяцей і юнацтва, выяўляць іх эстэтычную, выхаваўчую і пазнавальную каштоўнасць;

– характарызаваць літаратурную эпоху і асноўныя этапы яе развіцця;

– адрозніваць творчую манеру, стыль пісьменнікаў і паэтаў;

– весці дыялог па дыскусійных пытаннях у галіне сучаснай літаратуры для дзяцей і юнацтва;

– выкарыстоўваць набытыя веды ў прафесійнай практыцы.

Пры вывучэнні курса рэкамендавана выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі навучання і прынцыпы параўнальна-гістарычнага, культурна-гістарычнага, структурна-семантычнага, тыпалагічнага метадаў.

Усяго па дысцыпліне прадугледжана 152 гадзіны, з іх 80 гадзін – аўдыторных (60 – лекцыйных, 20 – семінарскіх). Форма кантролю – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | семін. |
| **Раздзел I. Гісторыя дзіцячай літаратуры** | | | |
| ***Тэма 1.*** Уводзіны | 2 | 2 | |
| ***Тэма 2.*** Узнікненне дзіцячай літаратуры. Літаратура XVII–XVIII стст. | 1 | 1 | |
| ***Тэма 3.*** Дзіцячая літаратура першай паловы XIX ст. | 3 | 1 | 2 |
| ***Тэма 4.*** Дзіцячая літаратура другой паловы XIX ст. | 1 | 1 | |
| ***Тэма 5.*** Агульная характарыстыка дзіцячай літаратуры канца XIX – пачатку XX ст. | 1 | 1 | |
| **Раздзел II. Руская дзіцячая літаратура XX – пачатку XXI ст.** | | | |
| ***Тэма 1.*** Развіццё рускай дзіцячай літаратуры ў 1920–1930-я гг. | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 2.*** Творчасць К.І.Чукоўскага | 2 | | 2 |
| ***Тэма 3.*** Творчасць Б.С.Жыткова і А.П.Гайдара | 2 | 2 | |
| ***Тэма 4.*** Літаратура для дзяцей і падлеткаў у гады Вялікай Айчыннай вайны і першага пасляваеннага дзесяцігоддзя (1940–1950-я гг.) | 2 | 2 | |
| ***Тэма 5.*** Асноўныя тэндэнцыі развіцця дзіцячай літаратуры ў 1960–1980-я гг. | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 6.*** Тэндэнцыі развіцця дзіцячай літаратуры ў 1990-я гг. Найноўшая літаратура пачатку XXI ст. | 10 | 6 | 4 |
| **Раздзел III. Дзіцячая літаратура далёкага замежжа** | | | |
| ***Тэма 1.*** Англійская дзіцячая літаратура | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 2.*** Амерыканская дзіцячая літаратура | 4 | 4 | |
| ***Тэма 3.*** Французская літаратура для дзяцей і юнацтва | 2 | 2 | |
| ***Тэма 4.*** Літаратура для дзяцей Скандынаўскіх краін | 2 | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | семін. |
| ***Тэма 5.*** Нямецкая літаратура для дзяцей | 2 | 2 | |
| ***Тэма 6.*** Літаратура для дзяцей славянскіх краін (Балгарыя, Чэхія, Польшча) | 2 | 2 | |
| **Раздзел IV. Беларуская дзіцячая літаратура** | | | |
| ***Тэма 1.*** Гістарычныя перадумовы ўзнікнення беларускай дзіцячай літаратуры | 2 | 2 | |
| ***Тэма 2.*** Пісьменнікі-адраджэнцы і дзіцячая літаратура | 2 | 2 | |
| ***Тэма 3.*** Агульныя заканамернасці развіцця дзіцячай літаратуры 1929–1956 гг. | 2 | 2 | |
| ***Тэма 4.*** Дзіцячая літаратура 1957–1985 гг.: проза і драматургія | 4 | 4 | |
| ***Тэма 5.*** Творчыя постаці ў дзіцячай паэзіі 1957–1985 гг. | 8 | 6 | 2 |
| ***Тэма 6.*** Сучасная дзіцячая проза (1986 – па сённяшні час) | 8 | 6 | 2 |
| ***Тэма 7.*** Сучасная дзіцячая паэзія (1986 – па сённяшні час) | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 8.*** Дзіцячая драматургія на сучасным этапе (1980–1990-я гг. – пачатак XXI ст.) | 2 | 2 | |
| Разам… | 80 | 60 | 20 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### *Тэма 1. Уводзіны.*

### Раздзел I. Гісторыя дзіцячай літаратуры

Паняцце “дзіцячая літаратура”. Сувязь літаратуры для дзяцей з народнай творчасцю, літаратурай для дарослых, педагогікай, псіхалогіяй і інш. Мастацкасць, займальнасць, даступнасць, прадметнасць і зрокавасць твораў для дзяцей. Герой дзіцячай кнігі. Вобраз аўтара ў дзіцячай прозе. Мова і стыль твораў для чытачоў розных узростаў. Афармленне дзіцячых кніг. Роля мастака ў стварэнні кнігі. Асаблівасці дзіцячай літаратуры, прызначанай для чытачоў розных узростаў. Літаратура мастацкая і навукова-пазнавальная. Функцыі дзіцячай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 2. Узнікненне дзіцячай літаратуры. Літаратура XVII–XVIII стст.*

Першыя творы для дзяцей і гістарычныя прычыны іх з’яўлення на тэрыторыі славянскіх дзяржаў. Лацінская граматыка Д.Герасімава (1491). “Азбука” Івана Фёдарава, кнігі Лаўрэнція Зізанія і іх асаблівасці. Зараджэнне першых аповесцей, гістарычнай літаратуры і публіцыстыкі для дзяцей. Карыён Істомін – першы рускі асветнік і дзіцячы паэт апошняй чвэрці XVII ст. Дзейнасць М.Г.Курганава. Гісторыя стварэння ім “Письмовика”. Змест, структура, ідэйная накіраванасць кнігі. Часопіс М.І.Навікова “Детское чтение для сердца и разума” (1785–1789). Змест, фарміраванне жанраў дзіцячай літаратуры і іх апрабацыя на яго старонках.

### *Тэма 3. Дзіцячая літаратура першай паловы XIX ст.*

Дзіцячая літаратура першай чвэрці XIX ст. Уплыў падзей Айчыннай вайны 1812 г. і паўстання “декабристов” на лёс рускага мастацтва і стварэння твораў для дзяцей. Развіццё прозы. Дзіцячыя часопісы “Друг юношества и всяких лет” (1807–1814), “Новое детское чтение” (1821–1824) і інш. Змест і ідэйная накіраванасць часопісаў. Паэзія для дзяцей. Творы І.А.Крылова, В.А.Жукоўскага, А.С.Пушкіна ў чытанні дзяцей. Дзіцячыя вершы А.С.Шышкова (1754–1814). Карціны рускай прыроды, адлюстраванне свету дзіцячых забаў.

Вершы А.Ф.Мерзлякова (1778–1836), іх сувязь з народнай творчасцю. Дзіцячая літаратура другой чвэрці XIX ст. Дзейнасць В.Р.Бялінскага, М.Г.Чарнышэўскага, М.А.Дабралюбава – вышэйшае дасягненне ў гісторыі дзіцячай літаратуры гэтага перыяду.

Творчая дзейнасць А.В.Ішымавай (1806–1881), П.Р.Фурмана (1816–1856), В.Бур'янава (1809–1888).

Літаратурная і педагагічная дзейнасць А.Пагарэльскага (1787–1836). "Чёрная курица, или Подземные жители". Ідэйная накіраванасць, мастацкія вартасці казкі.

У.Ф.Адоеўскі (1803–1862) як дзіцячы пісьменнік. "Детские сказки дедушки Иринея" (1840), "Детские песни дедушки Иринея". Іх ідэйная накіраванасць і мастацкія вартасці. "Городок в табакерке" – адзін з найбольш значных твораў рускай навукова-мастацкай літаратуры.

Літаратурная і педагагічная дзейнасць П.П.Яршова (1815–1869). Гісторыя стварэння казкі "Конёк-горбунок" (1834). Крыніцы казкі і яе мастацкія вартасці.

С.Ц.Аксакаў (1791–1859) як дзіцячы пісьменнік. Аповесць "Детские годы Багрова-внука". Сюжэт, кампазіцыя і мова аповесці.

Выданні і перавыданні твораў для дзяцей буйнейшых рускіх пісьменнікаў.

### *Тэма 4. Дзіцячая літаратура другой паловы XIX ст.*

Стан дзіцячай літаратуры ў 1860–1870-я гг. Тэматыка і праблематыка твораў М.А.Някрасава (1821–1878), Л.М.Талстога (1828–1910), І.С.Тургенева (1818–1883), А.К.Талстога (1817–1875), А.М.Пляшчэева (1825–1893) і інш.

Агульная характарыстыка дзіцячай літаратуры 1880–1890-х гг. Народніцтва ў дзіцячай літаратуры (П.І.Засодзімскі, А.Н.Аненская). Развіццё навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры. Навукова-мастацкія артыкулы, апавяданні і аповесці К.Э.Цыялкоўскага аб міжпланетных вандраваннях: "На луне" (1893), "Грёзы о земле и небе" (1845).

У.М.Гаршын (1855–1888). Казкі і апавяданні У.М.Гаршына для дзяцей ("Сказка о жабе и розе", "Лягушка-путешественница", "Гордая пальма", "Медведи"). Мастацкія вартасці твораў. Майстэрства псіхалагічнага аналізу. Своеасаблівасць стылю і кампазіцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

К.М.Станюковіч (1843–1903). “Морские рассказы”. Праблема гуманізму, гераізму, маральнай чысціні і абавязку.

А.П.Чэхаў (1860–1904). Творы А.П.Чэхава пра дзяцей: “Гриша”, “Событие”, “Житейская мелочь”, “Детство” і інш. Індывідуалізацыя характараў маленькіх герояў. Педагагічныя ідэалы А.П.Чэхава (“Дом”). Майстэрства пісьменніка ў падачы матэрыялу.

Д.Н.Мамін-Сібірак (1852–1912). Жанравая шматграннасць, тэматычная шырыня творчасці пісьменніка для дзяцей. Прыёмы стварэння характараў. Мастацкія вартасці апавяданняў. “Алёнушкины сказки” і гісторыя іх стварэння. Мова і стыль.

Асноўныя вынікі развіцця рускай дзіцячай літаратуры XIX ст.

### *Тэма 5. Агульная характарыстыка дзіцячай літаратуры канца XIX – пачатку XX ст.*

Рост цікавасці да пытанняў выхавання дзіцяці. Праблемы дзіцячага чытання і дзіцячай літаратуры на старонках педагагічных часопісаў. Далейшы рост выданняў для дзяцей. Лепшыя часопісы “Детское чтение”, “Юная Россия” з 1906 г., “Родник”, “Всходы” і інш. Аповесці Л.А.Чарскай, іх прыгодніцкі характар. Уменне стварыць займальны сюжэт, цікавыя характары (“Княжна Джаваха”, “Записки институтки” і інш.). Прыход у дзіцячую літаратуру І.А.Буніна, А.І.Купрына, А.А.Блока і інш. Зараджэнне пралетарскай дзіцячай літаратуры. Творы для дзяцей М.Горкага, А.С.Серафімовіча. Пачатак работы ў дзіцячай літаратуры К.І.Чукоўскага, М.М.Прышвіна. Значэнне рускай дзіцячай літаратуры старажытнага перыяду ў станаўленні сучаснай літаратуры для дзяцей і юнацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Руская дзіцячая літаратура XX – пачатку XXI ст.

### *Тэма 1. Развіццё рускай дзіцячай літаратуры ў 1920–1930-я гг.*

Уплыў камуністычнай ідэалогіі на стварэнне дзіцячай літаратуры. Роля М.Горкага ў развіцці дзіцячай літаратуры (“Литературу – детям”, “О темах”, “О сказках” і інш.). Творы М.Горкага для дзяцей: “Воробьишко”, “Случай с Евсейкой”, “Яшка” і іх мастацкія вартасці. Аповесць “Детство”. Наватар-

ства аўтара. Часопіс “Северное сияние” і яго роля ў фарміраванні жанраў дзіцячай літаратуры.

Творы для дзяцей У.У.Маякоўскага, Ю.А.Алешы. Тэмы, праблемы, майстэрства аўтараў. Творы для дзяцей А.М.Талстога (“Детство Никиты” і інш.), Р.І.Фраермана (“Дикая собака Динго, или Повесть о первой любви”).

Пачатак творчасці А.П.Гайдара, С.У.Міхалкова, А.Л.Барто, Л.А.Касіля і інш. Паэтызацыя рускай прыроды ў апавяданнях М.М.Прышвіна (зборнік “Золотой луг”). Творчасць Я.І.Чарушына – мастака і пісьменніка.

### *Тэма 2. Творчасць К.І.Чукоўскага*

Творчы шлях К.І.Чукоўскага (1882–1969). Сустрэча з М.Горкім (1916) і яе ўплыў на станаўленне К.І.Чукоўскага – дзіцячага пісьменніка. Энцыклапедычнасць, шматграннасць таленту К.І.Чукоўскага – паэта, пісьменніка, даследчыка. Гарманічнасць, чысціня, высокі гуманізм К.І.Чукоўскага.

Казкі “Тараканище”, “Крокодил”, “Мойдодыр”, “Доктор Айболит”, “Телефон”, іх сімволіка, гуманізм, майстэрства сюжэта. Ідэйна-мастацкія вартасці казак у прозе, іх наватарства. Вершы К.І.Чукоўскага і выхаванне паэтычнага слыху ў дзяцей. Творы К.І.Чукоўскага перыяду Вялікай Айчыннай вайны: нарыс “Дети и война”, вершы “Лёгкая добыча”, “Ленинградским детям”, “Загадки”. Асноўныя вытокі паэзіі К.І.Чукоўскага. Трынаццаць “заповедей” К.І.Чукоўскага дзіцячым паэтам. Класічнае даследаванне творчых магчымасцей дзіцяці: “От двух до пяти”. К.І.Чукоўскі – празаік. Аповесць “Солнечная”. Аўтабіяграфічная аповесць “Серебряный герб”. Асоба пісьменніка ў кнізе “Дневник” (1901–1929). Уплыў К.І.Чукоўскага на творчасць сучасных паэтаў (В.П.Берастаў, І.П.Такмакова, Р.С.Сэф і інш.).

Выданне і перавыданне твораў пісьменніка.

### *Тэма 3. Творчасць Б.С.Жыткова і А.П.Гайдара*

Энцыклапедычны характар, наватарства творчасці Б.С.Жыткова (1882–1938) для дзяцей: творы пра мора і маракоў (“Морские истории”), пра жывёл (“Кенгуру”, “Про обезьяну”, “Про слона” і інш.), пра тэхніку (“Свет без огня”, “Пароход” і інш.). Уменне пісьменніка будаваць сюжэт, псіхалагічныя характарыстыкі герояў, зрокавасць, бачнасць мастацкіх воб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разаў, мова твораў. “Что я видел” – своеасаблівая энцыклапедыя для дашкольнікаў. Вобраз Алёшы. Уплыў творчасці Б.С.Жыткова на развіццё сучаснай дзіцячай літаратуры. Пераклады твораў Б.С.Жыткова на розныя мовы.

Творчы шлях А.П.Гайдара (1904–1941). Уплыў рэвалюцыі і грамадзянскай вайны на асобу пісьменніка. Адносіны да творчасці пісьменніка раней і ў наш час. Творы А.П.Гайдара пра грамадзянскую вайну (“Школа”, “РВС”). Выразнасць, індывідуальная своеасаблівасць характараў герояў. Выхаваўчае значэнне вобраза Барыса Горыкава. Тэматыка і праблематыка твораў А.П.Гайдара 1920–1930-х гг. (“Дальние страны”, “Судьба барабанщика”, “Военная тайна”). Асаблівасці сюжэта, кампазіцыі, мовы твораў. Паэтызацыя дзяцінства. Падтэкст твораў: “Голубая чашка”, “Чук и Гек”, “Горячий камень” і інш. Гумар твораў А.П.Гайдара. “Тимур и его команда”. Педагагічная і мастацкая каштоўнасць творчасці А.П.Гайдара.

### *Тэма 4. Літаратура для дзяцей і падлеткаў у гады Вялікай Айчыннай вайны і першага пасляваеннага дзесяцігоддзя (1940–1950-я гг.)*

Першыя творы для дзяцей пра Вялікую Айчынную вайну. Тэма подзвігу, абароны Айчыны ў творчасці С.У.Міхалкова (“Мать”, “Гость”, “Десятилетний человек” і інш.).

Праблемы несумяшчальнасці вайны і дзяцінства ў аповесці В.П.Катаева “Сын полка”, у творах Л.А.Касіля “Дорогие мои мальчишки”, Л.Панцялеева “На ялике” і інш.

Творы пра вайну А.П.Платонава: “Смерти нет”, “Офицер и крестьянин” і інш. Ідэя народнага характару вайны. Філасофскае асэнсаванне паводзін людзей на вайне. Асаблівасці лексікі твораў, музычнасць прозы.

Гераічныя вобразы дзяцей, падлеткаў у творах Н.Ільіной, Л.Касмадзям’янскай, А.Кашавой, В.Асеевай і інш.

Творчасць А.Л.Барто (1906–1981). Кніга “Записки детского поэта” – тэарэтычнае крэда аўтара. Разнастайнасць тэматыкі твораў. Выданне і перавыданне твораў пісьменніцы.

Творчасць С.Я.Маршака. Жанравая і тэматычная разнастайнасць твораў С.Я.Маршака (“Детки в клетке”, “Пожар”, “Вчера и сегодня” і інш.). Роля і месца С.Я.Маршака ў развіцці сусветнай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Творчасць Л.А.Касіля (1905–1970). Аўтабіяграфічныя аповесці “Кондуит и Швабрания”. Мастацкія прыёмы адлюстравання рэчаіснасці і стварэння вобразаў. Тэматычная разнастайнасць твораў Л.А.Касіля.

Ідэалізацыя твораў для дзяцей, лакіроўка рэчаіснасці, тэорыя бесканфліктнасці ў дзіцячай літаратуры. Асноўныя этапы пісьменніцкай працы М.М.Прышвіна (1873–1954). Своеасаблівасць стылю твораў для дзяцей (“В краю дедушки Мазая”, “Золотой луг”, “Кладовая солнца”). Творчасць К.Г.Паустоўскага (1892–1968) для дзяцей. Выхаваўчы патэнцыял біяграфічных твораў аўтара “Орест Кипренский”, “Исаак Левитан” і інш. Спецыфічнасць стылю ў апавяданнях (зборнік “Летние дни”). Творы аўтара пра мастацтва, іх самабытнасць (“Золотая роза”, “Корзина с еловыми шишками”).

### *Тэма 5. Асноўныя тэндэнцыі развіцця дзіцячай літаратуры ў 1960–1980-я гг.*

Пашырэнне і паглыбленне тэматыкі і праблематыкі кніг для дзяцей. Гістарычная тэма ў дзіцячай літаратуры (С.П.Аляксееў і інш.). Тэма Вялікай Айчыннай вайны і яе рэалізацыя ў кнігах для дзяцей. Гераічны вобраз салдата ў творах С.А.Барудзіна “Повторение пройденного”, У.В.Багамолава “Иван”, Б.Л.Васільева “В списках не значился”, “А зори здесь тихие”, “Завтра была война”, Р.П.Пагодзіна “Живи, солдат” і інш. Далейшае раскрыццё праблем: чалавек на вайне, несумяшчальнасць вайны і дзяцінства.

Чалавек і прырода. Праблема захавання прыроды ў творчасці рускіх пісьменнікаў: М.І.Сладкова, Н.І.Дзмітрыева і інш. Пазнавальны аспект у кнігах.

Тэма працы ў кнігах для дзяцей. Новыя аспекты ў падачы матэрыялу. Л.А.Давыдычаў “Многотрудная жизнь Ивана Семенова – второклассника и второгодника…”, У.У.Мядзведзеў “Баранкин, будь человеком” і інш.

Праблемы фарміравання асобы, маральнага выхавання ў творчасці А.А.Ліханава, Ю.В.Якаўлева, У.Ю.Драгунскага, У.П.Крапівіна і інш. Раскрыццё ўнутраных псіхалагічных матываў маральнага станаўлення асобы падлетка.

Праблемы школьнага жыцця ў творчасці А.Т.Алексіна, Б.Л.Васільева, М.Ф.Фраловай, Р.Б.Осцера і інш. Развіццё казачнай і навукова-фантастычнай літаратуры (У.У.Мядзведзеў, Л.І.Лагін, Э.М.Успенскі і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Творчасць С.У.Міхалкова (1913–2009). Шматжанравасць творчасці аўтара. Вобраз станоўчага героя ў трылогіі "Дядя Стёпа". Садружнасць паэта і мастакоў.

Творчасць М.М.Носава (1908–1976). Аповесці і апавяданні пра жыццё дзяцей. Трылогія пра Нязнайку – новы тып казкі.

Творчасць А.Т.Алексіна (нар. 1924). Развіццё гайдараўскіх традыцый у сцвярджэнні актыўнага дабра. Аповесці "А тем временем где-то", "Третий в пятом ряду" і інш. Асаблівасці стылю. Гумар, гуманізм твораў А.Т.Алексіна.

Творчасць С.П.Аляксеева (нар. 1922) – майстра мастацкай гістарычнай прозы для малодшых школьнікаў ("Небывалое бывает", "История крепостного мальчика", "Сто рассказов о войне" і інш.).

Творчасць А.А.Ліханава (нар. 1935). Эстэтыка-функцыянальны аналіз твораў: "Крутые горы", "Чистые камушки", "Солнечное затмение" і інш. Памяць аб вайне, вобраз ветэрана вайны ў аповесці "Мой генерал". Вобраз дзіцяці, карціны працоўнага ваеннага дзяцінства, драматызм сітуацый: "Последние холода", "Детская библиотека".

Творчасць Ю.В.Коваля (1938–1995). Аповесці "Недопесок", "Поздним вечером ранней весной", "Кепка с карасями", "Картофельная собака", "Приключения Васи Куролесова", "Полынные сказки" і інш. Своеасаблівасці творчай манеры пісьменніка. Праблематыка кніг Ю.В.Коваля, мова твораў.

Творчасць Р.П.Пагодзіна (1925–1993). Падлетак – галоўны герой кніг Р.П.Пагодзіна. Праблема станаўлення асобы ў творах "Март", "Последний рассказ" і інш. Пошукі ідэалаў прыгажосці, асэнсаванне паняццяў дабра і благога: "Дубравка", "Альфред" і інш. Ваенная тэма ў творчасці Р.П.Пагодзіна: "Где леший живёт", "Живи, солдат" і інш. Эмацыянальнасць аўтарскай пазіцыі.

### *Тэма 6. Тэндэнцыі развіцця дзіцячай літаратуры ў 1990-я гг. Найноўшая літаратура пачатку XXI ст.*

Сацыяльныя, эканамічныя, агульнакультурныя асновы развіцця літаратуры для дзяцей і юнацтва. Асэнсаванне вопыту мінулых гадоў. Перагляд творчасці буйнейшых пісьменнікаў з пункту гледжання сучаснасці. Праблема маральнага выбару. Дзейнасць дзяржаўных і недзяржаўных выдавецтваў, якія выпускаюць літаратуру для дзяцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разнастайнасць тэм у сучаснай дзіцячай літаратуры. Творчасць для дзяцей Г.В.Сапгіра, Р.Б.Осцера, А.А.Усачова, В.П.Берастава, Д.А.Емца і інш. Тэматыка і праблематыка твораў Т.Ш.Крукавай “Костя + Ника”, “Мир кино”, “Ловушка для героя”, “Гений поневоле” і інш.

Асноўныя задачы, магчымасці дзіцячых, школьных і юнацкіх бібліятэк у распаўсюджанні літаратуры.

## Раздзел III. Дзіцячая літаратура далёкага замежжа

### *Тэма 1. Англійская дзіцячая літаратура*

Фальклор Англіі, яго спецыфічнасць. Своеасаблівасць англійскіх казак. “Три медведя”, “Три поросёнка” ў перакладзе рускіх пісьменнікаў. Малыя жанры англійскага фальклору: песні, смяшынкі, небыліцы і іншае ў перакладах С.Я.Маршака, К.І.Чукоўскага, І.П.Такмаковай і другіх.

Англійская дзіцячая літаратура XVIII–XIX стст. у чытанні дзяцей і юнацтва. Д.Дэфо (1680–1731). “Рабінзон Круза” – адзін з першых асветніцкіх твораў. Свабода асобы і сіла чалавечага духу ў творы. Гуманістычныя тэндэнцыі ў рамане. Пераклады і перапрацоўкі рамана Д.Дэфо. Узнікненне своеасаблівага жанру “рабінзанады” ў літаратуры для дзяцей у розных краінах. Д.Свіфт (1667–1745). “Путешествие Гулливера” і яго месца ў развіцці літаратуры англійскага Асветніцтва. Пераклады твора.

*Развіццё гістарычнага і сацыяльна-бытавога рамана*

Вальтэр Скот (1771–1832). “Айвенго” і іншыя творы ў чытанні падлеткаў і юнацтва. Гісторыя і сучаснасць у кнігах В.Скота. Раман “Айвенго” – лёс чалавечы, лёс народны ў пераломныя моманты гісторыі. Рыцарскі дух герояў В.Скота. Выданні і перавыданні твораў В.Скота.

Чарльз Дзікенс (1812–1870). Гуманістычныя і дэмакратычныя ідэі Ч.Дзікенса. Канцэпцыя “дзяцінства”. Свет дзяцінства ў рамане “Оливер Твист”. Сацыяльна-псіхалагічныя канфлікты ў рамане “Давид Копперфильд”. Панарама англійскай рэчаіснасці ў кнігах Ч.Дзікенса. Вобразы дзяцей у раманах аўтара. Своеасаблівасць кампазіцыі. Творчасць Ч.Дзікенса ў ацэнцы рускіх пісьменнікаў В.Р.Бялінскага, Л.М.Талстога.

Джэймс Грынвуд (1833–1929). “Подлинная история маленького оборвыша”. Пераклад К.І.Чукоўскага і Т.А.Багдановіч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Прыгодніцкі і навукова-фантастычны раман XIX – пачатку XX ст.*

Томас Майн Рыд (1818–1883) – майстар авантурна-геаграфічнага рамана (“Охотники за растениями”, “Ползуны по скалам”). Гістарычная тэма ў раманах М.Рыда. Адлюстраванне справядлівай барацьбы індзейцаў за сваю незалежнасць у рамане “Оцеола, вождь семинолов”. Майстэрства прыгодніцкай інтрыгі ў рамане “Всадник без головы”. Мастацкія прынцыпы М.Рыда.

Роберт Льюіс Стывенсан (1850–1894). Асоба і лёс пісьменніка. Праблематыка і мастацкія вартасці прыгодніцкага рамана “Остров сокровищ”. Вобраз Джыма Хокінса і яго роля ў самавыхаванні падлеткаў. Шырыня адлюстравання падзей, яркі каларыт у авантурна-гістарычных раманах “Чёрная стрела”, “Похищение”. Р.Стывенсан – паэт. Яго кніга “Детский цветник стихов”. Балада “Вересковый мёд” у чытанні падлеткаў.

Герберт Джордж Уэлс (1868–1946). Навукова-фантастычныя раманы, якія ўвайшлі ў дзіцячае чытанне, іх роля ў інтэлектуальным развіцці падлеткаў. Праблематыка і своеасаблівасць фантастыкі (“Человек-невидимка”, “Война миров”, “Машина времени”): касмічныя палёты, незвычайныя адкрыцці, тэхнічны прагрэс і лёс чалавека, праблема навукі.

Пераклады твораў аўтараў на мовы народаў свету, выданні і перавыданні твораў.

*Літаратурная казка для дзяцей у Англіі XIX – пачатку XX ст.*

Льюіс Кэрал (1832–1898) і яго казкі для дзяцей (“Алиса в стране чудес”, “Алиса в Зазеркалье”). Сучасная Л.Кэралу англійская рэчаіснасць, навуковая выдумка і яе адлюстраванне ў казках. Парадокс, пародыя, метафара і гіпербала ў паэтыцы Л.Кэрала. Пераклады твораў аўтара.

Оскар Уайльд (1856–1900). Эстэтычныя погляды пісьменніка. О.Уайльд у дзіцячым чытанні (“Мальчик-звезда”, “Счастливый принц”, “Соловей и роза” і інш.). Маральна-эстэтычныя праблемы, гуманізм у казках.

Рэдзьярд Джозэф Кіплінг (1856–1936) як дзіцячы пісьменнік (“Маугли”, “Рикки-Тики-Тави”, “Кошка, которая гуляет сама по себе” і інш.). Своеасаблівасць творчай манеры пісьменніка: гумар, небыліцы, паэтычнасць і інш. Творы Р.Д.Кіплінга ў перакладах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Творы для дзяцей англійскіх пісьменнікаў*
*XX – пачатку XXI ст.*

Асноўныя кірункі ў сучаснай дзіцячай літаратуры Англіі. Прадаўжэнне традыцый марскога прыгодніцкага рамана, літаратурная казка, бытавая аповесць, паэзія.

Рафаэль Сабаціні (1875–1950) – класік марскога прыгодніцкага рамана. "Одиссея капитана Блада". Своеасаблівасць творчай манеры мастака.

Х'ю Лофцінг (1886–1947). "Приключения доктора Дулитла". Традыцыі і наватарства ў жанры літаратурнай казкі. Перапрацоўка кніг К.Чукоўскім.

Алан Аляксандр Мілн (1882–1956). Чароўны свет яго добрай фантазіі ў казках пра Віні-Пуха. Своеасаблівасць кампазіцыі, дыялогі, трапнасць, дакладнасць характарыстык.

Далейшае развіццё жанру літаратурнай казкі: творчасць Джона Толкіна, Дональда Бісета, Памелы Трэверс, Льюіса Клайва, Джоан Ролінг і інш. Фальклор і сучаснасць у творах пісьменнікаў, маральна-эстэтычныя праблемы.

Лейла Берг і яе аповесці для школьнікаў і малодшых школьнікаў. Адкрыццё свету дзецям у "Маленьких рассказах про маленького Пита". Тэма сяброўства і ўзаемадапамогі ў кнізе апавяданняў "Приключения Ломтика". Глыбокае веданне дзіцячай псіхалогіі, гуманізм пісьменніцы. Гумар і яго выхаваўчае значэнне.

Сучасная англійская паэзія для дзяцей: вершы Роберта Грэйва "Скрипка за пенни", зборнік вершаў сучасных англійскіх паэтаў "Прятки". Праблематыка і мастацкія асаблівасці.

### *Тэма 2. Амерыканская дзіцячая літаратура*

Амерыканскі фальклор і яго спецыфічнасць (індзейскі, негрыцянскі фальклор і фальклор белых амерыканцаў). Гістарычныя і прыгодніцкія творы Фенімора Купера (1789–1851). Пенталогія раманаў пра Натаніеля Бампа. Вобразы індзейцаў. Шырыня паказу жыцця, вольналюбівыя матывы і гуманістычныя ідэі эпохі.

Эдгар По (1809–1849). Фантастыка і рэальнасць у яго творах. Навука як прадмет мастацкага адлюстравання ("Необыкновенное путешествие Ганса Пфаля" і інш.). Дэтэктыўны жанр у творчасці пісьменніка: "Золотой жук", "Убийство на улице Морг". Э.По – майстар навелы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Сацыяльна-бытавая аповесць, навела, раман*

Гарыет Бічэр-Стоу (1811–1896). Ідэі і вобразы рамана “Хижина дяди Тома”, прысвечанага лёсу неграў у Амерыцы. Праблема расавай дыскрымінацыі. Трагічны лёс Тома. Гуманізм Г.Бічэр-Стоу. Мастацкія вартасці твораў пісьменніцы.

Марк Твэн (1835–1910). Буйнейшы рэаліст і сатырык амерыканскай і сусветнай літаратуры. Эвалюцыя творчасці Марка Твэна. Кнігі пра Тома Соера, Гекльберы Фіна ў дзіцячым чытанні. Узаемаадносіны дзяцей і дарослых. Гістарычны раман-казка “Принц и нищий”. Сацыяльныя кантрасты ў адлюстраванні М.Твэна. Гуманізм пісьменніка.

*Літаратурная казка, апавяданне, аповесць*
*(XX – пачатак XXI ст.)*

Джоэл Чандлер Харыс (1848 – 1908). Казкі амерыканскіх неграў у яго перакладах. Дабрыня і справядлівасць у “Сказках дядюшки Римуса”.

Ліліян Фрэнк Баум (1856–1919). Ідэйна-мастацкія асаблівасці казак “Волшебник из страны Оз”, “Чудесная страна Оз”. Этычныя праблемы. Займальнасць сюжэта. Казкі Ф.Баума ў рускім перакладзе А.Волкава – “Волшебник изумрудного города”.

Эптан Сінклер (1878–1968). Казачная аповесць “Гномобиль”. Сатырычнае адлюстраванне некаторых бакоў амерыканскага жыцця. Пазнавальная каштоўнасць казкі.

Доктар С’юз (Тэадор Гайзел) і яго кнігі для дзяцей малодшага школьнага ўзросту (“Кот в колпаке”, “Зелёная яичница с ветчиной”, “Черепаха Эртель”, “Слон Хортон высиживает яйцо”). Эксцэнтрызм казак. Звонкі верш. Гумар. Гратэск.

Тэма дзяцінства ў творчасці Лінкальна Стэфанса (1866–1936) “Мальчик на лошади”, Эрскіна Колудэла (1903) “Мальчик из Джорджии”, Бэтсі Байрас (нар. 1928) “Лебединое лето”, Наталі Бэбіт (нар. 1932) “Бессмертный Тук” і інш. Псіхалагічныя і сацыяльныя канфлікты, маральныя праблемы ў творах мастакоў. Станаўленне характараў, асобы чалавека.

